**КОМИТЕТ ПО ПРОБЛЕМАМ ПОСЛЕДСТВИЙ КАТАСТРОФЫ НА ЧЕРНОБЫЛЬСКОЙ АЭС (КОМЧЕРНОБЫЛЬ)**

**РЕСПУБЛИКАНСКОЕ НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ "ИНСТИТУТ РАДИОЛОГИИ"**



# СТАНЕМ ЗДОРОВЫМИ, СИЛЬНЫМИ И КРАСИВЫМИ!

## (СЦЕНАРИЙ УТРЕННИКА)

Выхавацель:

–Бачыце, сябры якая цікавая вуліца. Колькі карыснага вы даведаліся, падарожнічаючы па ёй. А зараз нас чакае новае падарожжа з прыпынкамі на станцыях.
Садзімся на наш чароўны цягнічок і ўперад. Шчаслівага шляху!

Хлопчык-цягнічок:

Загудзеў цягнічок
І застукаў каблучок.
Чох-чох, чу-чу
Я далёка ўкачу.

Выхавацель:

–Стоп, цягнік! Прыпынак «Распраналка»! Стаянка 5 хвілін. Не затрымлівайцеся! Ой! А што гэта за енк? Сцішымся. Паслухаем. Што мы бачым?!
/Адказ/

–Правільна. Гэта плача кінуты абутак і нязграбна павешаная вопратка. А побач усміхаецца прыгожы пінжак. Дзеткі, як вы думаеце, чаго плача вопратка?
/Адказ/

–А чаму яна такая? Што можна сказаць пра хлопчыка-гаспадара гэтага адзення?
/Адказ/

–Давайце падкажам хлопчыку, што патрэбна зрабіць, каб адзенне не плакала.

Дзяўчынка:

Каб выгляд мець заўсёды свежы,
Не крыўдзі ўласнае адзежы.
Не любяць куртка і пінжак

Каб іх шпурлялі абы як.
Калі скідаць усё да кучы,
Адзежа стане як анучы

Хлопчык:

Трымай у парадку абутак уласны
Тады і табе ён паслужыць як след,
І ногі твае абароніць ад бед.

Выхавацель:
–Усе распрануліся? Тады ўвага. Цягнік адпраўляецца!
Наступная станцыя «Умывалка».

Хлопчык-цягнічок:

Загудзеў цягнічок
І застукаў каблучок.
Чох-чох, чу-чу
Я далёка ўкачу.

Выхавацель:
–Станцыя «Умывалка». Стоп машына!
/Выхавацель апранае нагрудны малюнак-маску Мыйдадзіра./
–Як я рад, што вы не прамахнулі самай значнай у жыцці станцыі «Умывалка». А ці ведаеце хто я?
/Адказ/
–Так.

Я – вялікі ўмывальнік
Я – вядомы Майдадзір,
Умывальнікаў начальнік
І мачалак камандзір!

Закашам рукаўцы, бяром мыльца і пад вадзіцу.

Дзяўчынка:

Эх, як весела бруіцца
Льецца, булькае вадзіца.
З мылам мы пад кранам мыем
Рукі, вушы, твар і шыю.

Усе разам:

Чыста мыцца – наша ўмова,
Той, хто чысты, – той здаровы.

Дзяўчынка:
–А я ведаю чароўныя словы для вадзіцы:

Вадзіца, вадзіца,
Памый ты мой тварык,
Каб вочкі блішчэлі,
Каб шчочкі краснелі,
Каб смяяўся раток,
Каб кусаўся зубок.

Хлопчык:

–А я ведаю як мыюцца коцікі:
Лапкай мяккай без вады
Умываюцца каты.
Мыюць вушы і насы,
І на спінцы валасы.

Дзяўчынка:
–І сапраўды.

Коцік прачынаецца – лапкамі ўмываецца.
Кветка прачынаецца – росамі ўмываецца.
Ну а мы з сястрычкаю мыемся вадзічкаю.

Выхавацель-Мыйдадзір:

–Вось што вам скажу я дзеткі
І скажу адкрыта:

Умывайцеся штодзённа,
Не люблю няўмытых.
Умывайцеся пад кранам,
Чыстаю вадзіцай.
Сам прыеду і праверу,
Як хто будзе мыцца.
Мыйце твар і рукі чыста,
Хлопцы і дзяўчынкі!
Не памыеце – скажу вам:
–Вы не дзеці – свінкі.

Дзяўчынка:

–Няхяй жыве мыла духмянае.
І ручнікі ільняныя,
І грэбні густыя,
І шчоткі зубныя!
Дык будзем жа мыцца, купацца,
Усюды няхай пагалоска ідзе:
–Вечная слава вадзе!

Выхавацель:
–Малайцы! Выціраемся і прычэсваемся. Давайце скажам чароўныя словы нашым валосікам, каб прыгожымі раслі.

Дзяўчынка:

Расці каса да пояса,
Не выпусці ні валаска.
Расці коска да пят –
Усе валоскі ў рад.
Расці, каса, не путайся,
Маму, дачушка, слухайся.

Выхавацель:
–Паправілі свае кашулькі, сукеначкі і рушым да наступнай станцыі.

Хлопчык-цягнічок:

Загудзеў цягнічок
І застукаў каблучок.
Чох-чох, чу-чу
Я далёка ўкачу.

Выхав. Станцыя "Харчавалка"! Стоп! Канечная станцыя!
Тут мы сустрэнемся з хлопчыкам Саукам і цікавымі парадамі, якімі патрэбна карыстацца у час яды.

Інсцэніроука верша Эдзі Агняцвет "Саука за сталом"

Ляжаць ля талеркі відэлец і нож.
Дзве чыстыя лыжкі ляжаць, іх не буду чапаць.
Яны ж не чапаюць мяне і маучаць.
З талеркі ен сербае крупнік – ой-ой!
Кавалачак мяса хапае рукой.
Ен пальцамі ловіць у шклянцы кампот.
Абрусам ен выцер і шчокі і рот.

Відэлец не уцерпеу:

- За цэлы мой век мне трапіуся першы такі чалавек!
- Ускочыла лыжка і ну рагатаць:
- Хі-хі, ха-ха-ха, ен дурненькі, відаць!

Саскочылі разам яны са стала- ніякая сіла спыніць не магла.

Відэлец і лыжка, і нож- ля дзвярэй.
Збянтэжаны Саука:
- Чакайце, э-гей!
Усе уцякаюць, вяртацца не хочуць.
-Хі-хі, ха-ха-хаі –толькі лыжкі рагочуць.

/ Лыжка, нож, відэлец, лыжачка цягнуцца за ніткі /

Выхав.
-Дзеткі, давайце вернем лыжкі, а для гэтага трэба успомніць правіла яды. Адначасова выпрауляюцца памылкі, дапушчаныя Саукам.

Правілы:
1. За стол садзіся з чыстымі рукамі, прычэсаным, у акуратнай вопратцы.
2. Трымай лыжку у правай руцэ.
3. Калі карыстаешся відэльцам і нажом, трымай відэлец у левай руцэ, а нож у правай.
4. Старанна пеоражоувай ежу, рот пры гэтым павінен быць закрыты.
5. Ежу бяры патрошку, еш бясшумна.
6. Выцірай губы сурвэткай.
7. За сталом сядзі прама, не кладзі локці на стол.
8. Устаючы з-за стала, падзякуй, ціха пастау на месца стул.

Дзяуч.

За сталом удвух сядзім
Мы з ахвотаю ядзім.
Нам зауседы усе па густу:
Каша, бульба і капуста.
- Я не буду не хачу я… -
Слоу такіх ты не пачуеш.

За сталом у нас заўжды
Цішыня падчас яды.

Хлопч.

Наша лыжачка працуе,
Каля місачкі танцуе
У яе адна з турбот:
Носіць, носіць кашу у рот.
- Ешще на здароуе, як вярнуся зноу я.

Дзяуч.

Не расказвала Аленка
Ела суп ці ела кашу.
Лепш за усе яее сукенка
Нам пра усе сама раскажа.

Дзяжурныя:

-Усе гатова. Сядайце, калі ласка, за стол.
Мама всех к столу зовет:
Пса Арапку, кошку-царапку, курочку-рябку.
Никому отказа нет, подан каждому обед:
Собачке- в миске, в блюдечке -киске,
курочке-несушке-пшена в черепушке,
А Машеньке в тарелке в глубокой, не в мелкой.

Прыемнага смаку.

Пасля яды кажуць "дзякуй", ставяць на месца стул,
ідуць паласкаць рот.

Хлопч.

Каб не зналі зубы згубы,
Трэба добра чысціць зубы.